# *Кракаўскія замалёўкі*

## Размова з беларускімі бардамі Таццянай Беланогай і Паўлам Кузічам

Сучасная беларуская бардаўская песня загучала ў Кракаве 7 мая на сцэне кавярні “Loch Camelot”. У рамках Дзён Беларускай культуры (7-9 V 2008), свае кампазіцыі для польскай публікі прадставілі маладыя спевакі з Мінска Таццяна Беланогая і Павел Кузіч. Прапануем Вашай увазе размову Аляксандры Зубік з таленавітымі беларускімі бардамі.

**Аляксандра Зубік: Вы ўпершыню прымаеце ўдзел у Днях Беларускай культуры ці прэзентацыя беларускай бардаўскай песні на польскай зямлі стала для вас ужо добрай традыцыяй?**

**Таццяна Беланогая:** Я ўжо другі раз прымаю ўдзел у такім праекце. Я ўдзельнічала яшчэ ў Днях Беларускай культуры ва Вроцлаве, гэта было летась 2007. Там, (ва Вроцлаве), нас вельмі добра сустрэлі, вакол былі сябры-беларусы і такое ўражанне склалася, што нашы паўсюль [смяецца]! Мне вельмі спадабаўся Вроцлаў таксама, але ён іншы. У Кракаве я ўпершыню, і ў мяне вельмі цёплыя ўражанні ад гэтага горада. Мне падалося, што я тут нібы калісьці ўжо была… Агульнае адчуццё ўтульнага дому, што ў гэтым горадзе людзі адзін аднаго ведаюць. Можа таму, што я прыехала ў старую частку горада, я ня ведаю, што там у блоках. Але мне падаецца, што ў гэтым горадзе ёсць сваё “Я” , і прычым такое вельмі-вельмі прывабнае, яго энэргетыка мне спадабалася.

**Павел Кузіч:** На Дні культуры я вось ужо трэцці год прыязджаю ў Кракаў. Першы раз, калі я тут быў, мне вельмі запомніўся пах ванілі. Горад мяне вельмі ўразіў сваёй старыною, гэта па-першае; па-другое, канешне, я першы раз быў за мяжою. Я ўбачыў, што існуе іншае жыццё, цывілізаванае можна сказаць, дзе цябе ніхто не штурхае пад бакі і не ставіцца да цябе як да якогасьці шкаляра. Мне вельмі прыемна тут знаходзіцца.

**А.З.:З чаго пачаўся ваш “бардаўскі шлях”, што падштурхнула вас да самастойнай творчасці? Стаць бардам - гэта свядомы выбар?**

**Т. Б.:** Мяне падшурхнулі нашыя беларускія дарогі. Дарога і прырода мяне натхняюць на песню. У мяне так было. Менавіта дарога… У мяне нічога не было, адукацыі музычнай не было, ні на якіх інструмэнтах граць не ўмела, дома валялася некая старая гітара таты, ён на ёй таксама не граў. Я ўзяла яе выпадкова, нават не магу патлумачыць. З часам гітара для мяне стала найбольш простай формай выражаць сябе. Я думаю, менавіта гітара ўздзельнічае і вельмі глыбока пранікае.

**П. К.:** Я сябе бардам ніколі не лічыў і, мабыць, лічыць не буду. Я проста магу сказаць пра сябе, што я муз*ы*ка, я – проста Паша-муз*ы*ка. Я сябе вось бачу ў вобразе муз*ы*кі і ўсё.

**А.З.:Ці мела (альбо мае) ўплыў на ваша прафесійнае станаўленне творчасць іншых бардаў?**

**Т. Б.:** Калі казаць пра маю ранейшую творчасць, то мела. Перш за ўсё, крупным планам, паўплывала філасофія расійскага барда Аляксандра Башлачова і паэзія Янішчыц. Калі зараз, то я магу сказаць, што я ўжо паступова выходжу на сваё ўяўленне творчасці, да свайго гучання, да свайго “голасу”. Мяне даволі часта параўноўваюць з расійскай спявачкай Янкай, але я яе доўга не слухала і лічу ўвогуле, што такое параўнанне ў пэўным сэнсе непазбежна, бо жанчын-бардаў навогул вельмі мала.

**П. К.:** На мяне вельмі паўплываў сваімі станоўчымі пажаданнямі і сваёй маральнай падтрымкай Алесь Камоцкі. Ён мне дапамог паверыць у сябе, і за гэта я яму вельмі ўдзячны. Канешне, я часам слухаю бардаўскую музыку, але ж мне значна бліжэй проста музыка, і таму глебу для натхнення я шукаю ў электроннай, класічнай і рок-музыцы.

**А.З.:Трэба адзначыць ваша добрае валоданне як гітарай, так і голасам. У вас ёсць некая музычная адукацыя?**

**Т. Б.:** Не, я не маю музычнай адукацыі. Я памятаю: мяне аддалі ў музычную школу на баян, але я прахадзіла туды месяц, і засталіся вельмі дрэнныя ўспаміны, нават за месяц. Я была маленечкай дзяўчынкай, мяне нават не было бачна з-за гэтага баяну. Як можна было мяне аддаць на гэты інструмэнт? Я памятаю таго страшэннага выкладчыка, які мне заўсёды тройкі ставіў, няводнай пяцёркі. Увогуле, жахлівыя ўспаміны… І ў мяне такое адчуванне, што ўсё такое, што з чалавечай савецкай вышыні – адукацыя! [выгаварвае пампезна] – гэта мала што значыць. Так гэта значыць, калі ты вытрымаеш і табе хопіць душэўнай сілы, каб потым гэта скарыстаць. Але мне не хапіла. Я нават тады, яшчэ малая, але разумела, што я не вытрымаю гэтай "ломкі". Таму ў мяне няма ніякай музычнай адукацыі.

**П. К.:** Я ў музычнай школе вучыўся граць на баяне. Хаця ў мяне быў цудоўны выкладчык па сальфеджыо. Дзякуй ёй вялікі за тое, што яна цярпела мяне, маю нецямлівасць. На конт баяну: спачатку ў мяне добра ўсё атрымлівалася, але пазней, калі мне пачалі ставіць тройкі, мяне адвярнула ад яго. Ведаеце, я лічу, што гэта хібы сістэмы адукацыі, калі падштурхоўваюць тройкамі. Калі чалавек свабодны ўнутры, яго ніякімі пуджаннямі не падбадзёрыш, а наадварот адвароціш. Мне ўвесь час, калі пачынаюць казаць "прыходзь на тое і тое, а ні то табе будзе тое і тое", я проста не прыходжу, у мяне пачынаецца адмоўная рэакцыя. Тое самае наконт баяна, што я не вельмі люблю гэты інструмэнт. А гітару я ўзяў сам, сам навучыўся.

**А.З.:Большасць спевакоў ставіцца да свайго голаса, як да сапраўднага Боскага "падарунка". Вы займаецеся "шліфоўкай" свайго голаса?**

**Т. Б.:** Мне вельмі б хацелася папрацаваць над голасам, вельмі хацелася б знайсці адпаведнага чалавека, насамрэч. Я падыйшла ўжо да такой мяжы, што мне гэта трэба: мне неабходна больш з розумам ставіцца да творчасці, патрэбна тэхнічная свабода. Але пакуль што я гэтым не займаюся.

**П. К.:** Я таксама падыйшоў да мяжы, што мне патрэбны выкладчык. Зараз усё упіраецца ў фінансы. Былі б фінансы, былі б выкладчыкі. Але ж, я не губляю час дарма, крышачку ўзяў некаторыя ўрокі, проста некаторыя дыхальныя практыкаванні у выкладчыкаў, якім мала плаціць трэба. Лічу, што вакал – вельмі патрэбная рэч. А так, спяваць пакуль я не ўмею. Я ўжо гэта разумею. Зараз я ўжо дайшоў да такога ўзроўня выканання на гітары, што голас і гітара сталі кантраставаць адно з другім і проста немагчыма, калі слухаеш больш-меньш нармальную гітару, слухаць ненармальны вакал. Трэба і спяваць нармальна.

**А.З.:Адзін мой знаёмы літаратар у прыватнай бяседзе мне прызнаўся, што не можа працаваць, знаходзячыся за мяжой. Але калі прыязджае дамоў, то можа пісаць практычна ўсюды: седзячы на вакзале, у парку… Як праходзіць творчы працэс у вас? Вы патрабуеце нейкіх асаблівых умоў для творчасці?**

**Т. Б.:** У мяне адбываецца ўсё вельмі спантанна. Калі мяне штосьці ўразіць вельмі (чалавек, размова…), я магу прыйсці і адразу напісаць песню. У мяне як маланка. Нейкіх асаблівых умоў для мяне не трэба. Я памятаю як я напісала песню *"Музыка новага дня",* якая, дарэчы, прагучала на "Песня свабоды III". Гэта быў інтэрнат, гэта быў шалёны дзень, усе хадзілі нешта, а я сядзела і пісала песню. Такое было адчуццё нібы ўпадаеш у транс, яна нібы сама льецца.

**П. К.:** Для мяне самае галоўнае, каб я не думаў, што хтосьці за мной сочыць, хтосьці мяне слухае. Калі я, напрыклад, буду ў цэнтры горада, і буду ведаць, што мяне ніхто не слухае, я буду спакойна займацца творчасцю. Але ж калі я займаюся творчасцю, і хоць хто-небудзь слухае ці там чуе, у мяне пачынаюць з'яўляцца розныя праблемы такога плана, што я думаю, што можа я, па-першае,

камусьці перашкаджаю. Хаця гэта – яшчэ дурніца, яна нечаста ўзнікае. Часцей за ўсё я проста баюся выказваць тое, што накапілася ў падсвядомасці, таму што ў мяне часам бываюць песні і з мацюгамі… У мяне “Рыба” (першая форма песні) можа быць вельмі не эстэтычная, і толькі крышачку пазней яна прыводзіцца да выгляду нармальнага, таму што ў маіх песнях спачатку ідзе паток свядомасці. Што там у галаве сядзіць, хто ведае?

**А.З.:Большасць вашых кампазіцый паўстае на ўласныя вершы. Гэта адпавядае, як вядома, бардаўскай традыцыі, калі постаць муз*ы*кі-барда з'яўляецца нібы “3 ў 1”: спалучае ў сабе паэта, аўтара музыкі і выканаўцу. Якім чынам гэтыя тры пачаткі бардаўскай дзейнасці існуюць у вас? Што спачатку ідзе? Слова, музыка…**

**Т. Б.:** У мяне вось такое адчуванне, што калі прыходзіць песня, то нібы “нясуцца коні”,  і ў гэтых “конях” свой рытм. І калі гэтыя “коні” лятуць, я прыдумываю словы [смяецца]. Але ў мяне ўсё адразу: коні, людзі… У мяне проста рытм і слова прыходзяць адразу. Прычым я магу адразу напісаць песню, а магу праз год дапісаць яе. Вось *“Метро”*, дарэчы, была дапісана праз год. Быў першы слупок, я не разумела, мне так спадабалася як яна пачынаецца і думаю, няўжо я яе не дапішу? Але нічога не ішло і толькі праз год прыйшоў іншы слупок.

**П. К.:**У мяне з'яўляецца першай музыка, у мяне заўжды музыка ў галаве, яна заўжды са мной, яна грае, грае, грае… Я хаджу ўвесь час з плейэрам, можна сказаць, і разумею тых, хто з плейэрам. І, напрыклад, чаму я такі рассеяны? Таму што ў мяне музыка іграе ўвесь час, я там рытмы выбіваю, выстукваю, мяне “каўбасіць”. Што ў мяне цяпер грае [заглядваецца на свой плейэр]… ну штосьці такое “энц-энц”, элементарнае, простае. А бываюць выпадкі, калі пачынаюць гучаць цікавыя мелодыі, ды ўжо цалкам тады слухаю. Вось таму і музыка для мяне спачатку. А словы я ўжо проста накладаю на музыку, таму што я не магу знайсці тэкстаў, якія будуць адпавядаць атмасферы. Словы рэдка выходзяць па-за музыку, іх трэба выцягваць з мяне: спачатку ідуць патокі свядомасці, якіясьці толькі гукі (а, о, у, э, і), а пазней раз – і з'яўляецца цэлае слова, цэлыя формы, а потым толькі пачынаеш разумець, які сэнс можна прыкласці да гэтых словаў. У асноўным я накіроўваюся на музыку, гэтым і тлумачыцца “лажовасць” маіх ранейшых тэкстаў. Яны не дасканалыя. Я і не так даўно пачаў глядзець на тэксты з пункту гледжання мастака, а да гэтага словы былі чымсці такім, каб “накласці” на музыку.

**А.З.:Акрамя ўласных вершаў у сваіх песнях вы выкарыстоўваеце тэксты іншых паэтаў?**

**Т. Б.:** Так, у мяне ёсць шмат песень на тэксты іншых паэтаў. Мяне больш цікавіць сучасная паэзія і, у першую чаргу, Яўгенія Янішчыц. На яе вершы ў мяне паўстала сама больш песень. Ёсць адна песня на верш таленавітага паэта, сапраўднага генія нашай культуры Глеба Лабадзенкі, вельмі паважаю яго. І Наталлю Кучмель таксама. На новым альбоме *“Двукропак”* ёсць яе верш. Канешне, ў мяне ёсць песні на словы Багдановіча і Жылкі, але сучасную паэзію я люблю больш.

**П. К.:** Не, ў мяне няма песень на словы іншых аўтараў. Зараз я чытаю паэзію Ларысы Геніюш. Наколькі яе творы прасякнуты любоўю да хараства Радзімы! Паэзію я чытаю толькі з мэтай павышэння ўзроўню ўласнай культуры. Часам узнікаюць у мяне мелодыі на тэксты некаторых пісьменнікаў, але ж гэтыя мелодыі, мне здаецца, ужо нібы вядомыя. Такое ўражанне, што гэтыя мелодыі ўжо ў кагосьці ёсць. Таму я не пішу.

**А.З.:У праграме канцэрта прагучалі разнастайныя песні. Таццяна, запытаюся спачатку ў вас. Для польскай публіцы былі прадстаўлены песні як з папярэдніх альбомаў, так і з нядаўна выданай кружэлкі “Двукроп’е” [N. B. нягледзячы на малады ўзрост, спявачка прадставіла слухачам ужо чатыры альбомы]. Сярод выкананых вамі кампазыцый былі па-сапраўднаму “жаночыя” лірычныя песні, такія як *“Балюча”, “Метро”, “Зіма-вакзал”, “Човен”.* Разам з тым, мяне, як слухача, вельмі ўразілі вашыя неспадзявана па-мужскі вострыя сацыяльна-палітычныя песні: *“Белая птушка”, “Дзеці неба”, “IV Сусьветная***

***вайна", "Нябачныя танкі".*** **Чым быў абумоўлены выбар рэпертурара для Дзён Беларускае культуры?**

**Т. Б.:** Па-першае, мне нядаўна зрабілі аперацыю, і пакуль што мне нельга браць высокія ноты. Таму я падабрала рэпертуар больш-меньш у выгоднай танальнасці, але рознай тэматыкі, каб мінімальна акрэсліць тое, чым я займаюся. З іншага боку, тут я адчуваю сабе свабоднай, і таму хацелася больш скіравацца на сацыяльны бок. Калі я, напрыклад, маю канцэрт у Беларусі, мне адразу прамым тэкстам кажуць: "Таня, пра сцяг лепей не спявай". Я адказваю: "Добра, я ня буду спяваць пра сцяг, але я буду хаця б спяваць на беларускай мове (!)". Сам факт спявання на беларускай мове ўжо выклікае незадавальненне. Гэта, канешне, камічная сітуацыя, але ж яна прысутнічае на Беларусі, бо мала хто размаўляе на беларускай мове. Я лічу, што калі чалавек выхаваны ў нармальнай сям'і, ён успрыме гэта – "маладзец!", а калі выхаваны ў злой сям'і, то ён не зразумее мяне, бо не разумее сябе ў гэтым свеце. Я думаю, што мова не мусіць быць зараз камянём такім, не павінна раздзяляць беларускі народ. Можа, мы яшчэ не на мяжы такой, каб усе размаўлялі на беларускай мове. Не, размаўляй, можа, і на расійскай, але ты ў душы беларус, і прызнай гэта. Я не хачу сказаць, давайце ўсе пяройдзем на беларускую мову! Канешне, гэта быў бы ідэальны варыянт, але зараз гэта проста не рэальна, прычым што ў такой таталітарнай сістэме. І я тут хацела праспяваць менавіта сацыяльныя песні, таму што мне тут можна сказаць, тое чаго падчас канцэртаў у Беларусі мне нельга.

**А.З.:Павел, а як вы падыйшлі да пытання адбору песен для Дзён Беларускай культуры?**

**П. К.:** Я спяваў тыя песні, якія людзям больш за ўсё падабаюцца, больш папулярныя і тыя, што падабаюца муз*ы*кам, з якімі я супрацоўнічаю.

**А. З.: Ваш "*Вожык*", напэўна, ужо стаў вельмі папулярным, альбо студэнцкая песенка, ня памятаю назвы…**

**П. К.:** Пра "*Mother fuck in Puschkin*"? Яна?

**А. З.: Так, дакладна.**

**П. К.:** Не ведаю, ці з'яўляецца гэтая песня шлягерам, ці не, я не так часта яе спяваю, хаця лічу, канешне, што песня добрая. Яна добра падкрэслівае сістэму адукацыі, якая ў мазгі "ўпіхвае", і чалавека пачынае вараціць ад гэтыў ведаў. Гэта дрэнна, патрэбна, каб чалавек сам хацеў ведаў. Калі яму пачынаюць "піхаць", дык ён будзе ненавідзець і літаратуру, і Коласа і Купалу, хаця гэта людзі цудоўныя. Тое самае і з рэлігіяй. Чалавек павінен сам прыйсці да гэтага, а калі будуць штосьці ў мазгі "ўпіхіваць", гэта нічога не дасць. Заўжды на кожнае парушэнне свабоды чалавека ідзе адмоўная рэакцыя, паўсюль. І сіла ўздзеяння на свабоду чалавека адгукаецца: чым мацнейшае было ўздзеянне, тым больш жахлівыя формы, яна пазней прымае выбух. Я спяваю песні проста пра наша жыццё, і самае галоўнае, чаго я хачу дамагчыся сваёй творчасцю – гэта, каб людзі глядзелі на ўсё пазітыўна, таму што калі пачынаецца песімізм, так пачынае чалавек падаць духам. Нельга ніколі падаць духам! Мне падаецца, што ў дадзенай сітуацыі, якая склалася ў нашай краіне, менавіта такі тып чалавека й павінен быць: мы павінны ўмець смела глядзець на любую справу, заўсёды знаходзіць выйсце.

**А.З.:Я ведаю, што за вашымі плячыма дастаткова вялікая колькасць конкурсаў бардаўскай песні. На вашу думку, што дае выканаўцу ўдзел у падобным конкурсе?**

**Т. Б.:** Для мяне - гэта знаёмства, людзі, не прага да перамогі, а проста магія некай супольнай працы, магія музыкі. Канешне, хтосьці едзе за перамогай. Але я, прынамсці, ні разу ня думала, што я еду за перамогай. Я проста еду і, дзякуй Богу, што я еду. Я люблю вандраваць, я - географ, для мяне дарога – гэта самае лепшае, што ёсць. Калі я проста прыеду і штосьці пагляджу (людзей,

іншую культуру), то для мяне гэта мае больш важнасці. Але калі ты перамагаеш, то ўжо іншая ступень пачынаецца. Напрыклад, дзякуючы перамозе на “ОРРА 2006” [N.B. Міжнародны Фестываль Бардаў у Польшчы] я запісала дыск. Не было б перамогі, не было б дыску. Варта думаць пра перамогу, але не ў такім плане, што я лепшы, я павінен там легчы, але перамагчы.

**П. К.:** Так, я згодны з Таццянай, што конкурс – гэта, у першую чаргу, цудоўныя знаёмствы. Там можна пазнаёміцца з многімі цікавымі людзьмі і потым з імі супрацоўнічаць. Гэта вельмі цудоўная рэч, якая ёсць у конкурсах, таму што мы можам адзін з другім больш кантактаваць, бо падчас канцэрта мы толькі паразмаўлялі ды разышліся, а тут ёсць магчымасьць застацца некаторы час разам.

А наконт перамог. Ёсць такі цікавы выраз, не так даўно прачытаў: прэзідэнтам краіны можа стаць толькі адзін чалавек, што ж рабіць усім астатнім некалькі мільёнам? Тое ж самае і наконт перамог на конкурсах. Гэтая мэта быць лепшым проста кажа аб рыначнай накіраваннасці людзей. Калі адна сумка - добрая, але ж нямодная; другая - дрэнная, але ж модная. Купілі тую, што модная, то добрая сумка пачне “грузіцца”, што яе не купілі і што яна атрымліваецца дрэнная? Вось гэта параўнанне вельмі ярка паказвае філасофію рыначнай арыентацыі людзей. Калі яны проста параўноўваюць сябе заўжды з кімсьці і глядзяць, што камусьці больш дасталося, камусьці штосьці лепш і хтосьці там лепшы за мяне… Я – лепшы, горшы. Гэтага няма, кожны – індывідуальнасць.

**А.З.:“Гастрольны графік”. У вашым сённяшнім творчым жыцці існуе гэта паняцце?**

**Т. Б.:** Не, маё гастрольнае жыццё не наладжана. Прычым я хачу сказаць, што яно не наладжана не толькі ў мяне, а не наладжана нават у нармальных прафесійных музыкаў, якія зарабляюць і кормяць сям’ю. То бок, могуць прапанаваць па гарадках маленькіх праехаць. Гэта таксама варта, я б з задавальненнем паездзіла па беларускіх гарадках, па вёсках, нават больш, чым у Кракаў, сур’ёзна. Але я з'яўляюся “нефармальным” музыкам.

**П. К.:** Не, такога паняцця ў мяне не існуе. Калі запрашаюць, тады згаджаюся. Часцей заўсёды так бывае. Але часам, калі я бачу, што людзі рэальна мяне эксплуатуюць і зарабляюць на мне грошы (мае сябры, напрыклад плацяць грошы за ўваход, а я не атрымліваю за гэта нічога), тады я кажу: “Не трэба мне, я не хачу выступаць, я лепш бясплатна выступлю для сяброў сваіх”.

**А.З.:Але ж, напрыклад, у галіне беларускай поп-культуры сітуацыя ў гэтым плане лепшая…**

**Т. Б.:** [перабівае] Там гразь такая! Там проста няма шчырасці, насамрэч! Не ведаю, хто ім верыць. Гэта вельмі тонкае пытанне: праспяваць так, каб у людзей у свядомасьці нешта перавярнулась. Яны ўсёж-такі працуюць на якую свядомасьць? На рабскую свядомасць, не беларускую, не нацыянальную, а гэта вельмі важна павярнуць людзей у правільны бок, да Бога, да Беларушчыны. Гэта вельмі-вельмі важна.

**А.З.:Менавіта ў гэтым, Таццяна, я так разумею, вы бачыцце сваё творчае credo.**

**Т. Б.:** Так, я хачу абудзіць сваёй творчасцю ў людзях павагу да сябе, да сваёй культуры. Усё, мне падаецца, грунтуецца на свабодзе, на павазе сябе, на павазе Бога ў сябе. Як Быкаў сказаў, мова дадзена Богам. Калі плююць на гэтую мову, значыць плююць на нешта святое. Гэта было маё свядомае рашэнне пісаць на беларускай мове, бо менавіта ў гэтым, у мове я пабачыла Бога. Я думаю, што спаквалля трэба абуджаць у народа гэтае жаданне проста быць самімі сабой, не цурацца таго, што мы маем сваё.

**А.З.:Павел, а на вашу думку, што з'уляецца сутнасццю творчасці?**

**П. К.:** Раней гэта было прадвіжэнне культуры беларускай. Зараз я разумею, што яна будзе рухацца наперад, калі я буду прасоўваць самога сябе ў беларускім плане. Сама сутнасць чалавека – гэта

творчасць, калі ён не займаецца творчасцю (у любым накірунку), у яго пачынаецца дэградацыя. І таму мы проста абавязаны займацца творчасцю дзеля таго, каб не дэградзіраваць. Іншага выйсця нельга знайсці. Я чуў цікавую прыказку ў ангельцаў ці ў каго іншага: лепш ісці чым бегчы, лепш стаяць чым ісці, лепш сядзець чым стаяць, лепш ляжаць чым сядзець, дык лепш памерці чым ляжаць. Вось такая вельмі зыркая прыказка. Таму сутнасць сваёй творчасці я бачу ў тым, каб проста займацца прадуктыўна творчасцю.

**А.З.:Бардаўская дзейнасць перашкаджае вашым асноўным на сённяшні дзень заняткам? Як паведаміла раней Таццяна, яна - географ. А вы, Павел?**

**П. К.:** Я яшчэ зяўляюся студэнтам аддзялення рэжысуры Інстытута культуры ў Мінску.

**А.З.:Ці ёсць у вашых жыццёвых планах месца для музыцы?**

**Т. Б.:** Так, насамрэч, я скончыла геаграфічны факультэт і працую цяпер у турызме. Гэта вельмі перашкаджае, таму што праца ёсць праца. А калі ты займаешся музыкай, то нешта з хібамі атрымоўваецца. Я думаю, што трэба выбіраць куды скіроўваць сваю духоўнасць. Сваю духоўную энэргію я больш усёж-такі хачу на музыку, але ў геаграфіі мне таксама вельмі падабаецца быць. У будучыні я хацела б займацца музыкай, стварыць свой гурт і выступаць акустычным складам.

**П. К.:** Тое, што я магу займацца музыкай, я ўжо дакладна зразумеў. І буду мэтакіравана займацца музыкай. Па сваім жыцці я некаторыя задачы не магу выканаць, у мяне ёсць некія псіхалагічныя хібы, ня ведаю. Мне не хапае гэтай дакладнасці, паслядоўнасці якая ёсць у акцёраў. Я магу заглядзецца на якісьці-небудзь слуп на вуліцы і не прыйсці на рэпетыцыю, напрыклад. Мне можа ў галаву стукнуць абы-што, магу залезці ў фантан, мокры вылезці, забыць штосьці (галаву добра, што не забываю) і г.д. А вось у музыцы, я заўважыў, што я акурат пападаю, пасьпяваю на канцэрты. Я пачынаю думаць, што ў гэтай сферы я магу сябе арганізаваць. Усе мае мазгі ў музыцы, усё астатняе здаецца толькі дадаткам, і на гэтыя дадаткі я часам не звяртаю ўвагі. Таму я разумею, што мне толькі ў музыку, музыку і музыку. Раз я ўжо цалкам там увесь знаходжуся, то няма куды дзявацца.

Размову з музыкамі праводзіла музыказнаўца Аляксандра Зубік